ОСВО 1-21 04 01-2013

# АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ
# ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

---

## ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
## ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ

**Спецыяльнасць** 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)

**Кваліфікацыя залежыць ад напрамку спецыяльнасці**

## ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ
## ПЕРВАЯ СТУПЕНЬ

**Специальность** 1-21 04 01 Культурология (по направлениям)

**Квалификация зависит от направления специальности**

## HIGHER EDUCATION
## FIRST STAGE

**Speciality** 1-21 04 01 Cultural Studies (majors in)

**Qualification is determined by the major**

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Мінск

УДК [378.1:008](083.74)(476)

Ключавыя словы: адукацыйная праграма, веды, вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, выкладчык, выніковая атэстацыя, вышэйшая адукацыя, заліковая адзінка, інфармацыйныя сістэмы ў культуры, кампетэнцыі, культуралогія, культуролаг-даледчык, культуролаг-менеджар, менеджмент міжнародных культурных сувязей, менеджмент рэкламы і сувязей з грамадскасцю, менеджмент сацыяльнай і культурнай сферы, патрабаванні, прыкладная культуралогія, сусветная і айчынная мастацкая культура, тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці), тэорыя і гісторыя культуры, уменні, якасць вышэйшай адукацыі.

## Прадмова

РАСПРАЦАВАНЫ ўстановай адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЕРДЖАНЫ І ЎВЕДЗЕНЫ Ў ДЗЕЯННЕ пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. №87.

Сапраўдны адукацыйны стандарт не можа быць тыражаваны і распаўсюджаны без дазволу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Выдадзены на беларускай мове

# ЗМЕСТ

**1 Галіна выкарыстання** ....................................................................................4
**2 Нарматыўныя спасылкі** ....................................................................................4
**3 Асноўныя тэрміны і азначэнні** ..........................................................................5
**4 Агульныя палажэнні** .........................................................................................5
4.1 Агульная характарыстыка спецыяльнасці........................................................5
4.2 Патрабаванні да ўзроўню адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ......................................................6
4.3 Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста.......................................................6
4.4 Формы атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ..........................................6
4.5 Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ........................................6
**5 Характарыстыка прафесійнай дзейнасці спецыяліста** ....................................7
5.1 Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста......................................................7
5.2 Аб'екты прафесійнай дзейнасці спецыяліста ...................................................7
5.3 Віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста ........................................................7
5.4 Задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста.....................................................7
5.5 Магчымасці працягу адукацыі спецыяліста.....................................................8
**6 Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста**..................................................8
6.1 Склад кампетэнцый спецыяліста.......................................................................8
6.2 Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста ...............................8
6.3 Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста................9
6.4 Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста...............................9
**7 Патрабаванні да вучэбна-праграмнай дакументацыі** ......................................10
7.1 Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі.......................................................10
7.2 Патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі ................10
7.3 Патрабаванні да складання графіка адукацыйнага працэсу..........................10
7.4 Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці). .......................................................................................11
7.5 Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах ..................................16
7.6 Патрабаванні да зместу і арганізацыі практык ..............................................27
**8 Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу** .....................................28
8.1 Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу.................28
8.2 Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу...........................................................................................28
8.3 Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу...........................................................................................28
8.4 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў ......................29
8.5 Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы .................29
8.6 Агульныя патрабаванні да формаў і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый ......................................................................................................29
**9 Патрабаванні да выніковай атэстацыі** ..............................................................30
9.1 Агульныя патрабаванні .......................................................................................30
9.2 Патрабаванні да дзяржаўнага экзамену ............................................................30
9.3 Патрабаванні да дыпломнай работы..................................................................30
**Дадатак Бібліяграфія** ..............................................................................................31

**АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ**
**ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ**

ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ. ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ
**Спецыяльнасць 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)**
Напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная)
*Кваліфікацыя* Культуролаг-даследчык. Выкладчык
Напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная)
*Кваліфікацыя* Культуролаг-менеджар

ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ. ПЕРВАЯ СТУПЕНЬ
**Специальность 1-21 04 01 Культурология (по направлениям)**
Направление специальности 1-21 04 01-01 Культурология (фундаментальная)
*Квалификация* Культуролог-исследователь. Преподаватель
Направление специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная)
*Квалификация* Культуролог-менеджер

HIGHER EDUCATION. FIRST STAGE
**Speciality 1-21 04 01 Cultural Studies (majors in)**
Major in 1-21 04 01-01 Cultural Studies (fundamental cultural studies)
*Qualification* Cultural Studies Specialist. Researcher. Teacher
Major in 1-21 04 01-02 Cultural Studies (applied cultural studies)
*Qualification* Cultural Studies Specialist. Manager

**Дата ўвядзення 2013-09-01**

## 1 Галіна выкарыстання

Стандарт выкарыстоўваецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, і адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" (далей, калі не ўстаноўлена іншае – адукацыйныя праграмы па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)"), вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

Стандарт абавязковы для выкарыстання ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку па адукацыйных праграмах па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)".

## 2 Нарматыўныя спасылкі

У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя прававыя акты:

СТБ 22.0.1-96 Система стандартов в сфере образования. Основные положения (далей – СТБ 22.0.1-96)

СТБ ИСО 9000-2006 Система менеджмента качества. Основные положения и словарь (далей – СТБ ИСО 9000-2006)

ОКРБ 011-2009 Общегосударственный классификатор Республики Беларусь "Специальности и квалификации" (далей – ОКРБ 011-2009)

ОКРБ 005-2011 Общегосударственный классификатор Республики Беларусь "Виды экономической деятельности" (далей – ОКРБ 005-2011)

Кодекс Республики Беларусь об образовании (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011, № 13, 2/1795) (далей – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі)

## 3 Асноўныя тэрміны і азначэнні

У дадзеным адукацыйным стандарце ўжываюцца тэрміны, якія ўстаноўлены ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

**Забеспячэнне якасці** – скаардынаваная дзейнасць па кіраўніцтве і кіраванні арганізацыяй, накіраваная на стварэнне ўпэўненасці, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ ИСО 9000-2006).

**Заліковая адзінка** – лічбавы спосаб выражэння працаёмкасці вучэбнай работы студэнта, які заснаваны на дасягненні вынікаў навучання.

**Кампетэнтнасць** – выражаная здольнасць прымяняць свае веды і ўменні (СТБ ИСО 9000-2006).

**Кампетэнцыя** – веды, уменні, вопыт і асобасныя якасці, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

**Кваліфікацыя** – веды, уменні і навыкі, неабходныя для той ці іншай прафесіі на рынках працы, якія пацверджаны дакументам аб адукацыі (СТБ 22.0.1-96).

**Культуралогія** – навука аб анталогіі, заканамернасцях генезісу і развіцці культуры як сістэмы, створанай у выніку творчага асэнсавання і пераўтварэння сацыяпрыроднага быцця.

**Прыкладная культуралогія** – вобласць культуралогіі, якая раскрывае сродкі, метады і формы прыцягнення чалавека ў свет культуры, якая вызначае механізм стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, абгрунтоўвае тэхналогію забеспячэння ўмоў для рэалізацыі духоўна-эўрыстычнага, інтэлектуальнага, мастацка-творчага патэнцыялу людзей, праяўлення іх сацыяльна-культурнай актыўнасці.

**Спецыяльнасць** – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе вызначаных ведаў, навыкаў і кампетэнцый, набываемых шляхам навучання і практычнага вопыту (ОКРБ 011-2009).

**Фундаментальная культуралогія** – вобласць культуралогіі, якая раскрывае метадалагічныя асновы, прынцыпы даследвання культуры, яе марфалогію, асноўныя заканамернасці функцыянавання культуратворчасці, шляхі і тэндэнцыі сацыяльна-гістарычнай дынамікі культуры.

## 4 Агульныя палажэнні

### 4.1 Агульная характарыстыка спецыяльнасці

Спецыяльнасць 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" у адпаведнасці з ОКРБ 011-2009 адносіцца да профілю адукацыі D "Гуманітарныя навукі", напрамку адукацыі 21 "Гуманітарныя навукі".

Згодна ОКРБ 011-2009 па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" прадугледжаны напрамкі спецыяльнасці і спецыялізацыі:

- 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)";
- 1-21 04 01-01 01 "Тэорыя і гісторыя культуры";
- 1-21 04 01-01 02 "Філасофія культуры";
- 1-21 04 01-01-03 "Сусветная і айчынная мастацкая культура";
- 1-21 04 01-01 04 "Амерыканістыка і англійская мова";
- 1-21 04 01-01 05 "Германістыка і нямецкая мова";
- 1-21 04 01-01 06 "Гебраістыка і англійская мова";
- 1-21 04 01-01 07 "Сацыялогія культуры";
- 1-21 04 01-01 08 "Галіцыстыка і французская мова";

– 1-21 04 01-01 09 “Англістыка і англійская мова”;
– 1-21 04 01-01 10 “Паланістыка і польская мова”;
– 1-21 04 01-02 “Культуралогія (прыкладная)”;
– 1-21 04 01-02 01 “Менеджмент сацыяльнай і культурнай сферы”;
– 1-21 04 01-02 02 “Менеджмент міжнародных культурных сувязей”;
– 1-21 04 01-02 03 “Менеджмент рэкламы і грамадскіх сувязей”;
– 1-21 04 01-02 04 “Інфармацыйныя сістэмы ў культуры”;
– 1-21 04 01-02 05 “Прадзюсерства ў сферы мастацтва”.

Напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-01 “Культуралогія (фундаментальная)” забяспечвае атрыманне кваліфікацыі “Культуролаг-даследчык. Выкладчык”, напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-02 “Культуралогія (прыкладная)” забяспечвае атрыманне кваліфікацыі “Культуролаг-менеджар”.

**4.2 Патрабаванні да ўзроўню адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені**

4.2.1 На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй або сярэднюю спецыяльную адукацыю, пацверджаную адпаведным дакументам аб адукацыі.

4.2.2 Прыём асоб для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пунктам 9 артыкула 57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

**4.3 Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста**

Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста:

– фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай, практыка-арыентаванай кампетэнтнасці, дазваляючай спалучаць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці;

– фарміраванне прафесійных кампетэнцый для работы ў галінах фундаментальнай і прыкладной культуралогіі.

**4.4 Формы атрымання вышэйшай адукацыі І ступені**

Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы: вочная (дзённая, вячэрняя), завочная (у т.л. дыстанцыйная).

**4.5 Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі І ступені**

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў дзённай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 “Культуралогія (па напрамках)” складае 4 гады.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў вячэрняй форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў завочнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі ў дыстанцыйнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 “Культуралогія (па напрамках)” асобамі, якія навучаюцца па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі І ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа быць скарочаны ўстановай вышэйшай адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў сапраўднага адукацыйнага стандарта.

Тэрмін навучання па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі І ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у вячэрняй і завочнай (у т.л. дыстанцыйнай) формах можа павялічвацца на 0,5–1 год адносна тэрміну навучання па дадзенай адукацыйнай праграме ў дзённай форме.

# 5 Характарыстыка прафесійнай дзейнасці спецыяліста

**5.1 Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста**

Асноўнымі сферамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляюцца:
- 63 Дзейнасць ў галіне інфармацыйнага абслугоўвання;
- 72 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі;
- 73 Рэкламная дзейнасць і вывучэнне кан'юнктуры рынку;
- 85 Адукацыя;
- 90 Творчая дзейнасць і забавы;
- 91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

**5.2 Аб'екты прафесійнай дзейнасці спецыяліста**

Аб'ектамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляюцца:
- фундаментальныя праблемы тэорыі і метадалогіі культуры;
- вопыт гісторыі сусветнай культуры;
- асаблівасці функцыянавання культуры ў сучасным грамадстве;
- культурныя формы, працэсы, практыкі ў гісторыі і сучаснасці;
- культурная і прыродная спадчына;
- формы, спосабы і сродкі культурных масавых камунікацый;
- міжасобаснае і міжкультурнае ўзаемадзеянне ў глабальным і лакальным вымярэннях;
- адукацыя ў сферы культуры;
- тэорыі і канцэпцыі, якія складаюць змест культуралогіі;
- працэс засваення, захавання, стварэння і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры.

**5.3 Віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць кампетэнтным у наступных відах дзейнасці:
- арганізацыйна-кіраўніцкай;
- інавацыйна-метадычнай;
- навукова-даследчай.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)" павінен быць кампетэнтным, акрамя таго, у педагагічнай дзейнасці.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 "Культуралогія (прыкладная)" павінен быць кампетэнтным, акрамя таго, у наступных відах дзейнасці:
- камерцыйнай, фінансава-гаспадарчай;
- маркетынгавай і рэкламна-інфармацыйнай.

**5.4 Задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных прафесійных задач:
- выкарыстанне дасягненняў навукі і інавацыйных тэхналогій у галіне культуры і адукацыі;
- фарміраванне ў розных катэгорый насельніцтва эстэтычнай, маральна-этычнай, прававой, палітычнай, экалагічнай, фізічнай культуры, забеспячэнне педагагічнага суправаджэння розных форм грамадскай арганізацыі вольнага часу;
- ажыццяўленне навукова-даследчай дзейнасці ў галіне тэорыі і гісторыі культуры;
- арганізацыя навукова-метадычнай дзейнасці ва ўстановах культуры і адукацыі;
- выкарыстанне сучасных форм і метадаў работы, інавацыйных тэхналогій у сферы прафесійнай дзейнасці.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)", акрамя таго, павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных прафесійных задач:

– распрацоўка навуковых тэм па актуальных праблемах развіцця сучаснай культуры;

– кіраўніцтва вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў;

– арганізацыя і правядзенне заняткаў па спецыяльных дысцыплінах ва ўстановах рознага ўзроўню адукацыі.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 "Культуралогія (прыкладная)", акрамя таго, павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных прафесійных задач:

– прагназаванне, планаванне і арганізацыя адміністратыўна-гаспадарчай, арганізацыйна-метадычнай, мастацка-творчай і выхаваўчай дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтваў;

– вырашэнне праблем развіцця сацыяльна-культурнай сферы за кошт выкарыстання розных працоўных матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў;

– забеспячэнне рэалізацыі мастацкіх каштоўнасцей і паслуг у сферы культуры на ўнутраным і знешніх рынках, арганізацыя міжкультурнай дзейнасці з замежнымі краінамі.

### 5.5 Магчымасці працягу адукацыі спецыяліста

Спецыяліст можа працягнуць адукацыю на II ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) у адпаведнасці з рэкамендацыямі ОКРБ 011-2009.

## 6 Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста

### 6.1 Змест кампетэнцый спецыяліста

Засваенне адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый,** якія ўключаюць веды і ўменні па вывучаных вучэбных дысцыплінах, уменне вучыцца;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый,** якія ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне кіравацца імі;

**прафесійных кампетэнцый,** якія ўключаюць здольнасць вырашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў абранай сферы прафесійнай дзейнасці.

### 6.2 Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста

Спецыяліст павінен:

– АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

– АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі .

– АК-4. Умець працаваць самастойна.

– АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

– АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

– АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютарам.

– АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

– АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

– АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне культуралогіі.

**6.3 Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста**

Спецыяліст павінен:

– САК-1. Валодаць якасцямі грамадскасці.

– САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

– САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

– САК-4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

– САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

– САК-6. Умець працаваць у камандзе.

– САК-7. З павагай і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

– САК-8. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульны ўзровень, дамагацца маральнага і фізічнага ўдасканалення сваёй асобы.

– САК-9. Фармаваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

**6.4 Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць здольным:

**Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць**

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

**Інавацыйна-метадычная дзейнасць**

ПК-4. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў.

ПК-5. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-6. Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбы насельніцтва ў розных відах вольнага часу.

**Навукова-даследчая дзейнасць**

ПК-7. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне культуралогіі.

ПК-8. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі.

ПК-9. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп'ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)", акрамя таго, павінен быць здольным:

**Педагагічная дзейнасць**

ПК-10. Выкладаць культуралагічныя дысцыпліны, вывучаць перадавы педагагічны вопыт, творча карыстацца ім у сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці.

ПК-11. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

ПК-12. Планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі дакументамі і дыдактычнымі матэрыяламі.

ПК-13. Улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

ПК-14. Выкарыстоўваць сучасныя методыкі і тэхнічныя сродкі навучання;

ПК-15. Рыхтаваць да прамежных формаў кантроля (тэстаў, калоквіумаў, удзелу ў канферэнцыях, чытаннях і г.д.).

ПК-16. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў навучанні.

ПК-17. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 "Культуралогія (прыкладная)", акрамя таго, павінен быць здольным:

**Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць**

ПК-18. Забяспечваць арганізацыйна-кіраўнічае функцыянаванне ўстаноў, арганізацый і аб'яднанняў сацыякультурнай сферы.

**Камерцыйная, фінансава-гаспадарчая дзейнасць**

ПК-19. Распрацоўваць сацыяльна-культурныя праекты ў камерцыйнай, фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

ПК-20. Арганізоўваць фінансава-эканамічнае забеспячэнне праектаў у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-21. Садзейнічаць пераходу ўстаноў культуры і мастацтваў на новыя ўмовы гаспадарання, садзейнічаць іх працы ва ўмовах рынкавых адносін, арганізоўваць знешнекультурную дзейнасць з замежнымі краінамі.

**Маркетынгавая і рэкламна-інфармацыйная дзейнасць**

ПК-22. Праводзіць маркетынгавыя даследаванні, распрацоўваць і ажыццяўляць міжнародныя, рэспубліканскія, рэгіянальныя і мэтавыя сацыяльна-культурныя праекты.

ПК-23. Складаць рэкламную стратэгію культурна-адпачынкавых праграм, прымяняць методыку падбору слоганаў для культурных праектаў.

ПК-24. Распрацоўваць і праводзіць кампаніі па сувязях з грамадскасцю, узаемадзейнічаць са сродкамі масавай інфармацыі.

## 7 Патрабаванні да вучэбна-праграмнай дакументацыі

### 7.1 Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі

Адукацыйныя праграмы па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" уключаюць наступную вучэбна-праграмную дакументацыю:

– тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці);

– вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі);

– тыпавыя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах;

– вучэбныя праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах;

– праграмы практык.

### 7.2 Патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі

7.2.1 Максімальны аб'ём вучэбнай нагрузкі студэнта не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы.

7.2.2 Аб'ём абавязковых аўдыторных заняткаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі адукацыйнага працэсу, аснашчэння вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, навукова-метадычнага забеспячэння, устанаўліваецца ў межах 24–32 гадзіны ў тыдзень.

7.2.3 У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне, уключаецца час, які прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) па вучэбнай дысцыпліне.

### 7.3 Патрабаванні да складання графіка адукацыйнага працэсу

7.3.1 Прыкладная колькасць тыдняў па відах дзейнасці для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі вызначаецца ў адпаведнасці з табліцай 1.

Табліца 1

| Віды дзейнасці, устанаўліваемыя ў вучэбным плане | Колькасць тыдняў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| Тэарэтычнае навучанне | 126 | 6804 |
| Экзаменацыйныя сесіі | 26 | 1404 |
| Практыка | 8 | 432 |
| Дыпломнае праектаванне | 4 | 216 |
| Выніковая атэстацыя | 3 | 162 |
| Канікулы | 32 | - |
| Усяго | 199 | 9018 |

7.3.2 Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі) установа вышэйшай адукацыі мае права ўносіць змены ў графік адукацыйнага працэсу пры ўмове захавання патрабаванняў да зместу адукацыйнай праграмы, указаных у дадзеным адукацыйным стандарце.

7.3.3 Пры завочнай форме атрымання вышэйшай адукацыі студэнту павінна быць забяспечана магчымасць вучэбных заняткаў з асобамі з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ў аб'ёме не менш за 200 гадзін у год.

**7.4 Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці)**

7.4.1 Тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцах 2,3 адукацыйнага стандарта.

Напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)

Табліца 2

| № п/п | Назва цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб'ём работы (у гадзінах) | | | Залікo-выя адзінкі | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх | | | |
| | | | Аўдыторныя заняткі | Самастойная работа | | |
| 1 | **Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін** | **632** | **306** | **326** | **17** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***344*** | ***170*** | ***174*** | ***9*** | |
| 1.1 | Філасофія | 84 | 42 | 42 | 2 | АК-1-6,8,10; САК-1-3,5 |
| 1.2 | Інтэграваны модуль "Эканоміка" | 116 | 60 | 56 | 3 | АК-1-6,10; САК-1-3,5,8; ПК-3-5,8 |
| 1.3 | Інтэграваны модуль "Паліталогія" | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1-6,9; САК-1-2,7. |
| 1.4 | Інтэграваны модуль "Гісторыя" | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1-4,6,8,9; САК-1-3,5,7; ПК-3,4,8 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***288*** | ***136*** | ***152*** | ***8*** | АК-1-5,8-10; САК-1-3,5-7 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **2** | **Цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін** | **1416** | **774** | **642** | **39,5** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***932*** | ***516*** | ***416*** | ***25,5*** | |
| 2.1 | Бяспека жыццядзейнасці чалавека | 102 | 68 | 34 | 3 | АК-1,2,6,7; САК-2-4,9; ПК-1,12 |
| 2.2 | Беларуская мова (прафесійная лексіка) | 68 | 34 | 34 | 2 | АК-1,4,8,9; САК-1-3,5,7,9; ПК-1-3,9,11-13,15,17 |
| 2.3 | Замежная мова | 272 | 150 | 122 | 7,5 | АК-1-4,8,9; САК-1-3,5; ПК-7,14 |
| 2.4 | Беларуская і сусветная літаратура | 196 | 102 | 94 | 5 | АК-1,3-6,9-10; САК-1-3,5-9; ПК-11,13,15,17 |
| 2.5 | Педагогіка | 94 | 50 | 44 | 2,5 | АК-1-6,8,9; САК-2,3,8,9; ПК-1,6,8,10-12,14-17 |
| 2.6 | Псіхалогія | 132 | 78 | 54 | 3,5 | АК-1-6,8-10; САК-1-9; ПК-1,5,6,8,13 |
| 2.7 | Асновы інфармацыйных тэхналогій | 68 | 34 | 34 | 2 | АК-2,4,7,9; САК-2,3,8; ПК-2,3,5,8,9,14,16 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***484*** | ***258*** | ***226*** | ***14*** | АК-1-4,6; САК-2,3,7; ПК-2,3,5,9,16 |
| **3** | **Цыкл спецыяльных дысцыплін** | **3636** | **2218** | **1418** | **98,5** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***2268*** | ***1336*** | ***932*** | ***59,5*** | |
| 3.1 | Уводзіны ў спецыяльнасць | 64 | 36 | 28 | 2 | АК-4,5,8; САК-1-3; ПК-2-4 |
| 3.2 | Фундаментальная культуралогія | 424 | 258 | 166 | 11,5 | АК-1-6,8,10; САК-1-3,5,9; ПК-3-5,7-11 |
| 3.3 | Тэорыя і гісторыя культуры | 372 | 226 | 146 | 9,5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3,5,7,8; ПК-1-5,7,17 |
| 3.4 | Сучасныя галіны культуралагічных ведаў | 200 | 110 | 90 | 5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3,5,7; ПК-1,3-5,10-17 |
| 3.5 | Прыкладная культуралогія | 378 | 232 | 146 | 9,5 | АК-1-6,8-10; САК-1-3,5-6; ПК-1-7,10-17 |
| 3.6 | Гісторыя мастацтваў | 444 | 262 | 182 | 12 | АК-1-5,8,9; САК-1-5; ПК-1,3,4 |
| 3.7 | Інфармацыйныя | 386 | 212 | 174 | 10 | АК-1,7-9; |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | тэхналогії ў культуры | | | | | САК-1-3; ПК-2-5,9,11,12,14,16 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***1368*** | ***882*** | ***486*** | ***39*** | АК-1-6,8-10; САК-2-3; ПК-3-17 |
| **4** | **Цыкл дысцыплін спецыялізацый** | **770** | **568** | **202** | **22,5** | АК-1-10; САК-1-3,5-6; ПК-1-5,10-17 |
| **5** | **Выкананне курсавых работ** | **80** | – | **80** | **2** | АК-3,4,8; ПК-7-9 |
| **6** | **Факультатыўныя дысцыпліны** | **270** | **270** | – | – | АК-8,6; САК-4 |
| **7** | **Экзаменацыйныя сесіі** | **1404** | – | **1404** | **38** | АК-1,2,6-8; САК-2,3; ПК-2,4,8 |
| | **Усяго** | **8208** | **4136** | **4072** | **217,5** | |
| **8**<br>8.1 | **Практыка**<br>азнаямленчая (вучэбная) (1 тыдзень) | 54 | – | 54 | 1,5 | АК-1,2,8,9; САК-1-3; ПК-4,6,8,9 |
| 8.2 | педагагічная (вытворчая) (3 тыдні) | 162 | – | 162 | 4,5 | АК-1,3,9,10; САК-2,3,6-8; ПК-10-17 |
| 8.3 | пераддыпломная (вытворчая) (4 тыдні) | 216 | – | 216 | 6 | АК-1,5,9,10; САК-2,3,5; ПК-1-17 |
| **9** | **Дыпломнае праектаванне** | **216** | – | **216** | **6** | АК-1-7,9,10; ПК-2-5,7-9,13,14,16 |
| **10** | **Выніковая атэстацыя** | **162** | – | **162** | **4,5** | АК-4,5,8; САК-2,5 |
| **11** | **Дадатковыя віды навучання** | **/420** | **/420** | | | |
| 11.1 | Фізічная культура | /420 | /420 | – | – | АК-4; САК-4,6 |

Напрамак спецыяльнасці 1-21 04 01-02 “Культуралогія (прыкладная)”

Табліца 3

| № п/п | Назва цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб’ём работы (у гадзінах) | | | Заліковыя адзінкі | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх | | | |
| | | | Аўдыторныя заняткі | Самастойная работа | | |
| **1** | **Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін** | **632** | **306** | **326** | **17** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***344*** | ***170*** | ***174*** | ***9*** | |
| 1.1 | Філасофія | 84 | 42 | 42 | 2 | АК-1-6,8,10; САК-1-3,5 |
| 1.2 | Інтэграваны модуль “Эканоміка” | 116 | 60 | 56 | 3 | АК-1-6,10; САК-1-3,5,8; ПК-3-5,8,19-21 |
| 1.3 | Інтэграваны модуль “Паліталогія” | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1-6,9; САК-1-2,7. |
| 1.4 | Інтэграваны модуль “Гісторыя” | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1-4,6,8,9; САК-1-3,5,7; |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | ПК-3-4,8 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***288*** | ***136*** | ***152*** | ***8*** | АК-1-5,8-10; САК-1-3,5-7 |
| **2** | **Цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін** | **1398** | **774** | **624** | **38** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***932*** | ***516*** | ***416*** | ***25,5*** | |
| 2.1 | Бяспека жыццядзейнасці чалавека | 102 | 68 | 34 | 3 | АК-1,2,6,7; САК-2-4,9; ПК-1,18 |
| 2.2 | Беларуская мова (прафесійная лексіка) | 68 | 34 | 34 | 2 | АК-1,4,8,9; САК-1-3,5,7,9; ПК-1,3,9,24 |
| 2.3 | Замежная мова | 272 | 150 | 122 | 7,5 | АК-1-4,8,9; САК-1-3,5; ПК-7 |
| 2.4 | Беларуская і сусветная літаратура | 196 | 102 | 94 | 5 | АК-1,3-6,9-10; САК-1-3,5-9 |
| 2.5 | Педагогіка | 94 | 50 | 44 | 2,5 | АК-1-6,8,9; САК-2,3,8,9; ПК-1,6,8 |
| 2.6 | Псіхалогія | 132 | 78 | 54 | 3,5 | АК-1-6,8-10; САК-1-9; ПК-1,5,6,8,18,23,24 |
| 2.7 | Асновы інфармацыйных тэхналогій | 68 | 34 | 34 | 2 | АК-2,4,7,9; САК-2,3,8; ПК-2, 3,5,8,9,19,21-24 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***466*** | ***258*** | ***208*** | ***12,5*** | АК-1-4,6; САК-2,3,7; ПК-2,3,5,9 |
| **3** | **Цыкл спецыяльных дысцыплін** | **3454** | **2042** | **1412** | **98,5** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | ***2246*** | ***1332*** | ***914*** | ***62,5*** | |
| 3.1 | Фундаментальная культуралогія | 92 | 54 | 38 | 2 | АК-1-6,8,10; САК-1-3,5,9; ПК-3,5,7-9 |
| 3.2 | Тэорыя і гісторыя культуры | 404 | 214 | 190 | 10,5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3,5,7,8; ПК-1-5,7 |
| 3.3 | Прыкладная культуралогія | 590 | 338 | 252 | 16,5 | АК-1-6,8-10; САК-1-3,5-6; ПК-1-7,18-24 |
| 3.4 | Гісторыя мастацтваў | 408 | 262 | 146 | 12 | АК-1-5,8,9; САК-1-5 |
| 3.5 | Інфармацыйныя тэхналогіі ў культуры | 376 | 212 | 164 | 10 | АК-1-7,9; САК-1-3; ПК-2-5,9,19, 22-24 |
| 3.6 | Менеджмент і маркетынг у сферы культуры | 376 | 252 | 124 | 11,5 | АК-1-6,8-10; САК-1-6; ПК-2-6,18-24 |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | ***1208*** | ***710*** | ***498*** | ***36*** | АК-1-6,8-10; САК-2,3; |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | ПК-3-9,18-24 |
| **4** | **Цыкл дысцыплін спецыялізацый** | **870** | **572** | **298** | **24,5** | АК-1-10; САК-1-3, 5,6; ПК-1-5,18-24 |
| **5** | **Выкананне курсавых праектаў (работ)** | **180** | – | **180** | **4,5** | АК-3,4,8; ПК-7-9 |
| **6** | **Факультатыўныя дысцыпліны** | **270** | **270** | – | – | АК-8,6; САК-4 |
| **7** | **Экзаменацыйныя сесіі** | **1404** | – | **1404** | **35** | |
| | **Усяго** | **8208** | **3964** | **4244** | **217,5** | |
| **8**<br>8.1 | **Практыка**<br>азнаямленчая (вучэбная) (1 тыдзень) | 54 | – | 54 | 1,5 | АК-1,2,8,9; САК-1-3; ПК-4,6,8,9 |
| 8.2 | тэхналагічная (вытворчая) (3 тыдні) | 162 | – | 162 | 4,5 | АК-1,9,10; САК-2,3, 6-8; ПК-18-24 |
| 8.3 | пераддыпломная (вытворчая) (4 тыдні) | 216 | – | 216 | 6 | АК-1,5,9,10; САК-2,3,5; ПК-1-9,18-24 |
| **9** | **Дыпломнае праектаванне** | **216** | – | **216** | **6** | АК-1-7,9,10; ПК-2-5,7-9,19 |
| **10** | **Выніковая атэстацыя** | **162** | – | **162** | **4,5** | АК-4,5,8; САК-2,5; ПК-2,3,5,7-9,19, 21-24 |
| **11** | **Дадатковыя віды навучання** | **/420** | **/420** | | | |
| 11.1 | Фізічная культура | /420 | /420 | – | – | АК-4; САК-4,6 |

7.4.2 На падставе тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі), у якім установа вышэйшай адукацыі мае права мяняць колькасць гадзін, адведзеных на засваенне вучэбных дысцыплін, у межах 15%, а аб'ёмы цыклаў дысцыплін – у межах 10% без перавышэння максімальнага тыднёвага аб'ёму нагрузкі студэнта і пры захаванні патрабаванняў да зместу адукацыйнай праграмы, указаных у дадзеным адукацыйным стандарце.

7.4.3 Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі) рэкамендуецца прадугледжваць вучэбныя дысцыпліны па выбары студэнта, колькасць вучэбных гадзін якіх складае да 50% ад колькасці вучэбных гадзін, адведзеных на кампанент установы вышэйшай адукацыі.

7.4.4 Пералік кампетэнцый, якія фарміруюцца пры вывучэнні вучэбных дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі, дапаўняецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў вучэбных праграмах.

7.4.5 Адна заліковая адзінка адпавядае 36–40 акадэмічным гадзінам.

Сума заліковых адзінак пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў дзённай форме павінна быць роўнай 60 за 1 год навучання. Сума заліковых адзінак за ўвесь перыяд навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў вячэрняй і завочнай (у т. л. дыстанцыйнай) формах павінна быць роўнай суме заліковых адзінак за ўвесь перыяд навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў дзённай форме.

7.4.6 Установы вышэйшай адукацыі маюць права пераводзіць да 40% прадугледжаных тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) аўдыторных заняткаў у кіруемую самастойную работу студэнта.

**7.5 Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах**

7.5.1 Праектуемыя вынікі засваення вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне дзяржаўнага кампанента кожнага цыкла прадстаўляюцца ў выглядзе абавязковага мінімуму зместу і патрабаванняў да ведаў, уменняў і валоданняў.

7.5.2 Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін устанаўліваецца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам "Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин", які ўключае абавязковы мінімум зместу і патрабаванняў да кампетэнцый, і з улікам Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

7.5.3 Цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін

***Бяспека жыццядзейнасці чалавека***

Арганізацыя абароны насельніцтва і аб'ектаў ад надзвычайных сітуацый. Першая дапамога ў надзвычайных сітуацыях. Забеспячэнне радыяцыйнай бяспекі. Глабальныя экалагічныя праблемы. Забеспячэнне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў. Забеспячэнне энергетычнай бяспекі і энергетычнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Энергазберагальныя тэхналогіі ў побыце. Забеспячэнне аховы працы. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да вытворчага асяроддзя. Вытворчая бяспека.

У выніку вывучэння інтэграванай вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– заканадаўства ў галіне пажарнай і радыяцыйнай бяспекі, абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый;

– асноўныя прынцыпы, сродкі і спосабы абароны ад надзвычайных сітуацый;

– асновы рацыянальнага прыродакарыстання, меры па папярэджанні экалагічнага дрэннага становішча геасфер Зямлі;

– прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне энергазберажэння;

– заканадаўства ў галіне аховы працы;

**умець:**

– ажыццяўляць арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі жыццядзейнасці;

– аналізаваць сітуацыю, распазнаваць крыніцу небяспекі і прадпрымаць дзеянні па выратаванні уласнага жыцця, жыцця вытворчага персаналу, памяншэння шкоды здароўю людзей;

– выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай і калектыўнай абароны;

**валодаць:**

– навыкамі абароны ад надзвычайных сітуацый і небяспечных вытворчых фактараў;

– навыкамі аказання першай дапамогі ў надзвычайных сітуацыях, пры няшчасных выпадках на вытворчасці і ў побыце.

***Беларуская мова (прафесійная лексіка)***

Генезіс беларускай мовы, яе развіццё ў часе. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле сферы ўжывання і характару маўленчых зносін. Беларускамоўная тэрміналагічная сістэма і спосабы яе апісання. Функцыянаванне фанетычнай і арфаэпічнай сістэм беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Арфаграфічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння. Нарматыўнае ўжыванне спецыяльных тэрмінаў:

назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў, лічэбнікаў. Нарматыўнае ўжыванне граматычных катэгорый і формаў дзеяслова. Функцыянальна-стылістычная характарыстыка службовых часцін мовы. Функцыянальныя стылі маўлення. Культура *прафесійнага маўлення.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– асаблівасці фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асноўныя нормы беларускага *літаратурнага вымаўлення* ў тэрміналагічнай лексіцы;

– сучасныя нормы беларускага правапісу;

– асаблівасці і заканамернасці ўтварэння тэрміналагічных слоў;

**умець:**

– перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;

– знаходзіць і выпраўляць недахопы і памылкі ў перакладзе тэкстаў па спецыяльнасці;

– самастойна ствараць розныя віды тэкстаў навуковага і вузкаспецыяльнага зместу;

**валодаць:**

– арфаэпічнымі, *арфаграфічнымі*, марфалагічнымі, лексічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі спецыяльнай лексікі.

*Замежная мова*

Асобасныя характарыстыкі. Камунікатыўна-паводніцкія стэрэатыпы ў сітуацыях бытавых зносін. Сацыякультурны партрэт краіны вывучаемай мовы і Рэспублікі Беларусь: нацыянальныя традыцыі і каштоўнасці. Сацыякультурны партрэт моладзі. Праблемы моладзі. Экалагічная культура. Бягучыя падзеі сацыяльна-палітычнага жыцця ў сувывучаемых краінах. Краіны вывучаемай мовы і Рэспубліка Беларусь у сучасным свеце. Бягучыя падзеі сацыяльна-палітычнага жыцця ў сувывучаемых краінах. Прадмет і змест спецыяльнасці. Агульнае ўяўленне аб структуры і характары прафесійнай дзейнасці спецыяліста і яе сацыякультурныя асаблівасці ў сувывучаемых краінах. Студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя: даклады, паведамленні. Рэфераванне і анатаванне артыкула па спецыяльнасці. Тыповыя сітуацыі вытворчых зносін. Сацыякультурныя нормы дзелавых зносін. Прафесійная этыка.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– асаблівасці сістэмы вывучаемай замежнай мовы ў яго фанетычным, лексічным і граматычным аспектах (у параўнанні з роднай мовай);

– сацыякультурныя нормы бытавых і дзелавых зносін, а таксама правілы моўнага этыкету, якія дазваляюць спецыялісту эфектыўна выкарыстоўваць замежную мову як сродак зносін у сучасным полікультурным свеце;

– гісторыю і культуру краін вывучаемай мовы;

**умець:**

– весці зносіны сацыякультурнага і прафесійнага характару;

– чытаць і перакладаць літаратуру па спецыяльнасці;

– пісьмова выказваць свае камунікатыўныя намеры ў розных сферах;

– разумець аўтэнтычную іншамоўную размову на слых;

**валодаць:**

– усімі відамі чытання (для вывучэння, азнаямлення, прагляданне, пошуку), якія прадугледжваюць розную ступень разумення прачытанага;

– прыёмамі рэзюміравання атрыманай інфармацыі, аргументавана прадстаўляць свой пункт гледжання па апісаных фактах і падзеях, рабіць вывады;

– навыкамі вядзення дыскусіі па тэме / праблеме;

– навыкамі складання прыватнага і дзелавога ліста, правільна выкарыстоўваць формулы пісьмовых зносін;

– навыкамі рэферавання і анатавання прафесійна арыентаваных і агульнанавуковых тэкстаў з улікам рознай ступені сэнсавай кампрэсіі.

***Беларуская і сусветная літаратура***

Літаратура як частка сусветнай мастацкай культуры. Старабеларуская літаратура. Літаратура эпохі Адраджэння. Літаратура XIX ст. Літаратура XX ст. Нашаніўскі перыяд. Жанрава-стылёвае ўзбагачэнне літаратуры і ўключэнне яе ў агульнаеўрапейскі кантэкст. Мастацкія плыні ў літаратуры XX ст. і іх узаемадзеянне. Заходнебеларуская літаратура. Гуманістычны пафас літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Абнаўленне рэалізму ў 60–ыя гг. Ваенна-вясковая школа ў прозе 70-80-ых гг. Літаратурны рух канца XX – пачатку XXI стст. Асноўныя тэндэнцыі і этапы развіцця сусветнай мастацкай літаратуры: эстэтычныя кірункі, школы, плыні. Літаратура Антычнасці, еўрапейскае Сярэднявечча, эпоха Адраджэння. Літаратура XVII — XVIII стст. Літаратуры Заходняй Еўропы (XIX — пач. XXI стст.): французская, англійская, нямецкая. Літаратура Злучаных Штатаў Амерыкі. Лацінаамерыканская і японская літаратуры XX ст. Гісторыя славянскіх літаратур. Асноўныя тэндэнцыі развіцця рускай, польскай, украінскай, чэшскай, балгарскай літаратур.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце;
– спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;
– сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры з іншымі відамі мастацтва;
– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

**умець:**

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця;
– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;
– успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;
– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;
– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы;

**валодаць:**

– метадамі культурна-гістарычнага аналізу літаратурнага працэсу;
– асноўнымі паняццямі і катэгорыямі мастацкай інтэрпрэтацыі твора.

***Педагогіка***

Педагогіка ў сістэме навук. Прадмет і задачы педагогікі як навукі і вучэбнай дысцыпліны. Сістэма педагагічных навук і сувязь педагогікі з іншымі навукамі ў кантэксце інтэграцыі і дыферэнцыяцыі педагагічных ведаў. Асноўныя катэгорыі педагогікі. Праблема мэтавызначэння ў педагогіцы. Метадалогія і метады педагагічнай навукі. Развіццё, выхаванне, фарміраванне асобы. Сутнасць цэласнага педагагічнага працэсу, яго кампаненты, этапы, заканамернасці і прынцыпы. Гісторыя станаўлення і развіцця педагагічнай навукі. Дыдактыка як галіна педагагічных ведаў. Працэс навучання: мэты, задачы, функцыі, прынцыпы, метады, сродкі, формы арганізацыі. Паняцце зместу адукацыі. Сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Працэс выхавання: сутнасць, заканамернасці, прынцыпы, змест, кірункі, метады, формы, сродкі і тэхналогіі. Сацыякультурнае асяроддзе выхавання.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– метадалагічныя асновы педагогікі, гісторыю зараджэння, станаўлення і развіцця педагагічнай думкі;

– асноўныя катэгорыі педагогікі і сутнасць працэсаў адукацыі, выхавання, фарміравання і развіцця асобы;

– мэты, задачы, функцыі, заканамернасці, прынцыпы, метады, сродкі, формы арганізацыі працэсу навучання;

– тэорыю і тэхналогіі выхавання дзяцей і моладзі ў сучасным сацыякультурным асяроддзі;

**умець:**

– самастойна атрымліваць і карыстацца педагагічнымі ведамі ў прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы;

– рэалізоўваць дзейнасць ва ўстановах культуры і адукацыі;

– арганізоўваць выхаваўчую работу з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў установ сацыякультурнай сферы;

**валодаць:**

– алгарытмам аналізу педагагічных з'яў і супастаўлення іх з палажэннямі педагагічнай тэорыі;

– навыкамі праектавання адукацыйнага працэсу і шляхамі яго ўвасаблення на практыцы;

– навыкамі планавання зместу і этапаў рэалізацыі педагагічных праектаў.

***Псіхалогія***

Прадмет і задачы псіхалогіі як навукі. Паняцце аб псіхічных працэсах, уласцівасцях і станах. Псіхіка як вынік і фактар эвалюцыйнага працэсу. Асноўныя функцыянальныя блокі мозгу, іх роля ў кіраванні паводзінамі чалавека. Развіццё псіхікі і ўсведамлення. Структура, метады і асноўныя напрамкі сучаснай псіхалогіі. Пазнавальныя працэсы асобы: адчуванне і ўспрыманне, увага і памяць, мысленне і мова, уяўленне. Эмацыянальна-валявая і матывацыйна-патрэбнасная сферы асобы. Індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці асобы. Перыядызацыя ўзроставага развіцця чалавека. Псіхічнае развіццё чалавека на розных этапах антагенезу. Зносіны як сацыяльна-псіхалагічны феномен. Сацыяльная псіхалогія вялікіх і малых груп. Сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі асобы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– тэарэтычныя палажэнні агульнай, узростававай, сацыяльнай псіхалогіі;

– асноўныя катэгорыі, структуру, метады і напрамкі сучаснай псіхалагічнай навукі;

– псіхічныя працэсы, станы, уласцівасці асобы і спосабы педагагічнага ўздзеяння на іх ва ўстановах сацыякультурнай сферы;

– псіхалагічныя асаблівасці развіцця асобы на розных этапах антагенезу;

– прычыны дзелавых, асобасных і міжасобасных канфліктаў і тэхналогію іх вырашэння ва ўмовах установ сацыякультурнай сферы;

**умець:**

– самастойна карыстацца псіхалагічнымі ведамі ў прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы;

– характарызаваць заканамернасці і прынцыпы фарміравання і развіцця асобы ў розных відах дзейнасці;

– выкарытоўваць практычныя метады дыягностыкі і карэкцыі ўзроставых асаблівасцяў суб'ектаў сацыякультурнай дзейнасці;

**валодаць:**

– навыкамі самааналізу, псіхалагічнага разумення і інтэрпрэтацыі паводзін людзей, самарэалізацыі і самаўдасканалення;

– псіхалагічнай культурай, інструментальнымі псіхалагічнымі ведамі і навыкамі іх выкарыстання ў дзейнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы;

– псіхалагічнымі механізмамі сацыяльных уздзеянняў на чалавека і групу людзей як суб'ектаў сацыяльнага ўзаемадзеяння.

*Асновы інфармацыйных тэхналогій*

Гісторыя і тэндэнцыі развіцця інфармацыйных тэхналогій. Інфармацыя і інфармацыйныя працэсы. Тэхнічнае і праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій. Класіфікацыя і прызначэнне камп'ютарнай тэхнікі. Асноўныя этапы рашэння задач на ЭВМ. Тэкставыя рэдактары. Электронныя табліцы. Камп'ютарныя прэзентацыі. Сістэмы кіравання базамі даных. Лакальныя і глабальныя камп'ютарныя сеткі. Захаванне і абарона інфармацыі. Архіватары. Антывірусныя сродкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– гісторыю развіцця сродкаў захавання, перадачы і апрацоўкі інфармацыі;

– этапы развіцця і класіфікацыю камп'ютараў;

– базавыя канцэпцыі камп'ютарных тэхналогій і асновы лічбавых камунікацый;

– этапы апрацоўкі інфармацыі;

– архітэктуру сучаснага камп'ютара;

– файлавую структуру;

– класіфікацыю праграмнага забеспячэння;

– асноўныя катэгорыі прыкладных праграм і іх прызначэнне;

– інструменты і метады апрацоўкі інфармацыі ў тэкставых рэдактарах і электронных табліцах;

– прынцыпы пабудовы баз даных;

**умець:**

– працаваць у аперацыйным асяроддзі Windows і прыкладных праграмах.

– ажыццяўляць апрацоўку тэкставай інфармацыі;

– ствараць, рэдагаваць і фарматаваць табліцы, працаваць з формуламі і функцыямі;

– ажыццяўляць статыстычную апрацоўку даных;

– ствараць і рэдагаваць малюнкі, аб'екты, аўтафігуры, арганізацыйныя дыяграмы, подпісы;

– ствараць прэзентацыі;

– карыстацца электроннай поштай, рэсурсамі і пошукавымі сістэмамі глабальнай сеткі;

– карыстацца сэрвісным праграмным забеспячэннем;

**валодаць:**

– навыкамі працы з прыкладным праграмным забеспячэннем;

– асноўнымі спосабамі апрацоўкі інфармацыі з выкарыстаннем тэкставых рэдактараў, электронных табліц і прэзентацый;

– тэхналогіямі стварэння баз даных.

7.5.4 Цыкл спецыяльных дысцыплін

*Тэорыя і гісторыя культуры*

Актуальнасць вывучэння культуралагічных праблем у сучаснай цывілізацыі. Праблема развіцця якасна іншай культуры асобы як глабальны імператыў сучаснага грамадства. Працэс далучэння чалавека да свету культуры і сацыяльна-культурнай творчасці. Мастацкая культура як індыкатар стану ўсёй культуры. Узнікненне і развіццё культуралагічнай думкі. Прырода, культура і цывілізацыя: дыялектыка ўзаемадзеяння. Асаблівасці культурна-гістарычнай дынамікі. Праблема тыпалогіі культур. Беларуская культура: праблема ідэнтыфікацыі. Субкультура і контркультура, іх суадносіны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– асноўныя этапы развіцця культуры ў сувязі з сусветнай гісторыяй чалавецтва;

– суадносіны культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

**умець:**

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– аналізаваць ва ўзаемасувязі развіццё культуралогіі, рэлігіі, філасофіі, дасягненні навукі і адукацыі;

– засвоіць мабільную дыдактычную мадэль выкладання культуралогіі;

**валодаць:**

– асноўнымі заканамернасцямі культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва.

***Гісторыя мастацтваў***

*Музычнае.* Віды і жанры музычнага мастацтва. Музычнае мастацтва Старажытнага Свету, эпох Антычнасці, Сярэднявечча, Адраджэння, Барока, Асветніцтва, Рамантызму. Музычнае мастацтва XX ст. Гісторыя музычнай культуры Расіі і Беларусі: фарміраванне нацыянальных кампазітарскіх школ. Новыя стылявыя тэндэнцыі ў сучасным музычным мастацтве Расіі і Беларусі.

*Тэатральнае.* Тэатр і яго месца ў сістэме мастацкай культуры. Тэатральнае мастацтва эпох Антычнасці, Сярэднявечча, Адраджэння, Класіцызму, Асветніцтва, Рамантызму. Рускі тэатр: ад вытокаў да XX ст. Вытокі і гісторыя развіцця тэатра на Беларусі. Сучасныя тэатры Беларусі і Расіі: рэжысёры, акцёры, драматургі.

*Выяўлечае мастацтва.* Выяўленчае мастацтва як частка грамадскай свядомасці і вобразна-пачуццёвы спосаб адлюстравання свету. Асноўныя віды і жанры, выразныя сродкі. Мастацкія стылі і помнікі Старажытнага Егіпта і Заходняй Еўропы ў эпохі Антычнасці, Сярэдневякоўя, Адраджэння, Барока, Класіцызму, Рамантызму. Асноўныя стылі і напрамкі ў заходнееўрапейскім мастацтве XX ст. Мастацтва Старажытнай Русі. Рускае выяўленчае мастацтва XVIII – пачатку XX ст. Савецкае мастацтва. Выяўленчае мастацтва Беларусі XII – XX ст.: дойлідства, іканапіс, гравюра, партрэтны і пейзажны жывапіс, нацюрморт, вядучыя прадстаўнікі.

*Кінамастацтва.* Кінамастацтва як сінтэтычны від мастацтва. Віды і жанры ў кіно. Станаўленне вядучых кінашкол Францыі, Італіі, Швецыі, Германіі, Расіі. Фарміраванне кінамастацтва ў Беларусі.

*Фотамастацтва.* Спецыфіка тэхнагенных мастацтваў. Фотамастцва у сістэме сродкаў масавай камунікацыі. Гісторыя сусветнага фотамастацтва: этапы, стылі, майстры. Тэхнікі і жанры фотамастацтва. Беларускае фотамастацтва ў сусветным кантэксце.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– відавую і жанравую тыпалогію;

– гісторыю мастацкай культуры свету ў адпаведнасці з эпохамі, стылямі, накірункамі і школамі;

– асноўныя гістарычныя факты, падзеі, даты, імёны дзеячоў мастацтва;

– мастацкую культуру Беларусі і творчую дзейнасць беларускіх кампазітараў, мастакоў, дзеячоў тэатра і кіно;

**умець:**

– выяўляць заканамернасці фарміравання розных відаў мастацтва ў пэўныя эпохі;

– аналізаваць творы мастацва;

– канструяваць, здзяйсняць на практыцы працэс выкладання тэорыі і гісторыі мастацтваў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі;

**валодаць:**

– метадамі навукова-даследчай дзейнасці ў галіне тэорыі і гісторыі мастацтва;

– катэгарыяльным апаратам і спецыфічнай мовай розных відаў мастацтва;

– метадамі аналізу мастацкага твора;
– спосабамі рэпрэзентацыі твораў мастацтва ў вербальнай і візуальнай формах.

***Інфармацыйныя тэхналогіі ў культуры***

Асновы тэорыі вымярэння інфармацыі. Сістэмы шыфравання інфармацыі. Электронны лічбавы подпіс. Арганізацыя статыстычнага эксперыменту і апрацоўка вынікаў. Інфалагічнае мадэляванне ў галіне культуры. Аўтаматызацыя аналітычнай апрацоўкі інфармацыі. Web-праектаванне. Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання базамі даных. Базы даных у галіне культуры. Аўтаматызацыя дзейнасці бібліятэк. Выдавецкая падрыхтоўка інфармацыйных матэрыялаў. Тэхналогіі мультымедыя ў галіне культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**
– асновы тэорыі вымярэння інфармацыі;
– метады арганізацыі статыстычнага эксперыменту і апрацоўкі вынікаў;
– механізм выкарыстання электроннага лічбавага подпісу;
– метады і алгарытмы аўтаматызацыі апрацоўкі тэкставай інфармацыі;
– тэхналогіі праектавання Web-старонак;
– праблемы выкарыстання баз даных у галіне культуры;
– спосабы прадстаўлення ведаў у экспертных сістэмах;
– метады стварэння мультымедыйных інфармацыйных прадуктаў;
– канцэпцыі стварэння адзінай інфармацыйнай прасторы;

**умець:**
– будаваць інфалагічныя мадэлі прадметнай вобласці;
– праводзіць статыстычны эксперымент і апрацоўваць вынікі;
– выконваць афармленне Web-старонак;
– выкарыстоўваць базы даных у галіне культуры;
– распрацоўваць рэляцыйныя мадэлі баз даных;
– ствараць дакументы з уключэннем мультымедыйных рэсурсаў;

**валодаць:**
– метадамі праектавання інфармацыйных сістэм;
– статыстычнымі метадамі апрацоўкі эксперыменту;
– метадамі распрацоўкі Web-старонак;
– метадамі распрацоўкі баз данных у галіне культуры.

*Дысцыпліны напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)"*

***Уводзіны ў спецыяльнасць***

Прафесійная арыентацыя студэнтаў, разуменне імі сутнасці прафесіі, усвядомленае стаўленне да прафесійнай падрыхтоўкі. Адаптацыя да новых умоў вучобы ва ўніверсітэце. Першапачатковыя веды аб сутнасці, спецыфіцы прафесіі спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці, сістэму падрыхтоўкі студэнта ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**
– структуру кіравання ўніверсітэтам, яго гісторыю;
– азначэнне паняцця "сацыяльна-культурная дзейнасць";
– напрамкі спецыяльнасцей і спецыялізацый у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці, асноўныя ўстановы сацыякультурнай сферы (дзяржаўнага, грамадскага і прыватнага сектараў) у Рэспубліцы Беларусь;
– асноўныя патрабаванні, кваліфікацыйную характарыстыку і кампетэнцыі спецыяліста;
– асаблівасці арганізацыі вучэбна-творчай і навуковай работы студэнта;
– свае правы і абавязкі, патрабаванні да арганізацыі культуры быту ў інтэрнатах;

**умець:**

– рацыянальна арганізоўваць вучэбны і вольны час;

– карыстацца вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі;

– весці дзённік назіранняў;

– аргументаваць уласную думку;

**валодаць:**

– аб'ектыўным уяўленнем аб кампанентах прафесійнай кампетэнтнасці і відах прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– тэхналогіямі атрымання ведаў, уменняў і спецыяльных навыкаў ва ўніверсітэце;

– асновамі сучаснай арганізацыйнай культуры, ашчаднага выкарыстання часу для самастойнай работы, самаадукацыі ў сферы культуры.

***Фундаментальная культуралогія***

Культура як аб'ект вывучэння розных дысцыплін. Культуралогія як сістэма ведаў аб культуры. Актуалізацыя міжпрадметных сувязяў па айчыннай гісторыі, беларускай і сусветнай літаратуры, этнаграфіі, мастацкай культуры, філасофіі, фалькларыстыцы і іншых дысцыплінах. Асаблівасці метадалагічных прынцыпаў і метадаў для аналізу культуралагічных праблем. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі і формы культуры. Сэнс культуратворчасці. Культура і цывілізацыя: станаўленне планетарнай культуры. Прынцып дыялога культур – шлях да ўніверсальных каштоўнасцяў чалавецтва. Сучасная сацыякультурная сітуацыя: крызіс гуманізму. Праблема культуры на мяжы XIX–XX стст. Псіхалагічныя і экзістэнцыяльныя канцэпцыі культуры. Сутнасць мэты, задачы і віды міжкультурнай камунікацыі. Акультурацыя ў міжкультурнай камунікацыі: сутнасць, стратэгія, вынікі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– марфалогію культуры;

– сэнс базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– праблемы міжкультурных камунікацый ў кантэксце глабалізацыйных працэсаў;

– прыкладныя магчымасці культуралогіі ў сацыякультурнай сферы;

**умець:**

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– крытычна ўспрымаць сімвалы, плыні, феномены сусветнай і нацыянальнай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць дзейнасць у галіне культуры;

– адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі;

– аналізаваць артэфакты з семіятычнага, аксіялагічнага пунктаў гледжання;

– характарызаваць творы класічнай і масавай культуры;

**валодаць:**

– важнейшымі метадалагічнымі парадыгмамі, прынцыпамі і метадамі культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– методыкай прагназавання, планавання і ажыццяўлення дзейнасці ў галіне культуры.

***Сучасныя галіны культуралагічных ведаў***

Ключавыя напрамкі культуралогіі.

Фундаментальная культуралогія: культура, артэфакты, дынаміка, функцыі, тыпы, марфалогія, суб'ект, грамадства, антрапалогія, сацыядынаміка, коды, этнічная культура, нацыянальная культура, глабалізацыя, каштоўнасці, ідэалы, масавая культура.

Сацыяльная культуралогія: грамадства, цывілізацыя, дыялог, камунікацыя, культурная прастора, культурная палітыка, культурны імідж, этнічная культура, рэгіянальная культура.

Псіхалогія культуры: сублімацыя, лібіда, танатас, эрос, комплекс Эдзіпа, комплекс Электры, архетып, калектыўнае несвядомае, індывідуальнае несвядомае, канфігурацыя культуры, ідэнтыфікацыя, акультурацыя, інкультурацыя.

Культурная семантыка: знак, сімвал, знакавая форма, вобраз, значэнне, вербальны, іканічны, фармалізацыя, кантэкст, полісемія, канатацыя, дэнатацыя, інтэрпрэтацыя.

Прыкладная культуралогія: формы, метады тэхналогіі, сацыякультурнае праектаванне, менеджмент, культуратворчасць, мастацкая культура, культурны працэс, вольны час, арт-рынак, арт-тэрапія.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– асаблівасці грамадства як сацыяльнай рэальнасці і цэласнай самарэгулявальнай сістэмы;

– сацыяльныя інстытуты, якія забяспечваюць узнаўленне грамадскіх патрэбаў;

– асаблівасці асобы як суб'екта сацыяльнага дзеяння і сацыяльных узаемадзеянняў;

– паняцці сацыялізацыі і інкультурацыі;

– міжасобасныя адносіны ў групах;

**умець:**

– самастойна аналізаваць сацыяльную і культурную рэчаіснасць і працэсы, якія адбываюцца ў сістэме грамадства;

– прымяняць культуралагічныя метады і падыходы для вырашэння гуманітарных задач;

**валодаць:**

– рознымі спосабамі вербальнай і невербальнай камунікацыі;

– методыкай пабудовы і прымянення культуралагічных мадэляў для ацэнкі стану і прагнозу развіцця сацыякультурных працэсаў у сучасным грамадстве.

***Прыкладная культуралогія***

Прыкладная культуралогія як працэс засваення, захавання, стварэння і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры, спасціжэння індывідам вынікаў гэтай дзейнасці і працэс прыцягнення яго ў вытворчасць каштоўнасцей культуры. Сацыяльна-культурная дзейнасць як спецыялізаваная вобласць грамадскай практыкі. Прадмет, мэты і задачы, панятыйны апарат і крыніцы курса. Сацыяльна-культурная дзейнасць як інтэгратар грамадскага ўзаемадзеяння і фактар творчага развіцця асобы. Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці. Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць, прынцыпы, функцыі і метады сацыяльна-культурнай дзейнасці. Рэсурсная база сацыяльна-культурнай дзейнасці. Суб’екты сацыяльна-культурнай дзейнасці. Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– структурны склад і асноўныя функцыі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– асноўныя законы драматургічнай кампазіцыі;

– мэты, задачы, прынцыпы і кірункі сацыякультурнага праектавання;

– заканамернасці развіцця сучаснай арт-індустрыі ў Беларусі;

– спецыфіку выкарыстання канцэпцый, механізмаў і метадаў арт-менеджменту ў працэсе кіравання арт-індустрыяй;

**умець:**

– асэнсоўваць культурную практыку, тлумачыць пэўныя культурныя з’явы, выкарыстоўваць сацыякультурныя тэхналогіі;

– распрацоўваць праектнае рашэнне праблемнай сітуацыі на асобасным узроўні, на ўзроўні калектыву, насельніцкага пункту, сацыяльных, прафесійных і культурных супольнасцяў;

– выяўляць асноўныя напрамкі і тэндэнцыі развіцця арт-індустрыі;

– выконваць арганізацыйна-творчую дзейнасць у розных сегментах арт-індустрыі;

**валодаць:**

– тэарэтыка-метадалагічнымі і практычнымі падыходамі да сацыяльна-культурнага праектавання;

– прыёмамі работы спецыяліста ў арт-індустрыі.

*Дысцыпліны напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 "Культуралогія (прыкладная)"*

***Фундаментальная культуралогія***

Культура як аб'ект вывучэння розных дысцыплін. Культуралогія як сістэма ведаў аб культуры. Актуалізацыя міжпрадметных сувязяў па айчыннай гісторыі, беларускай і сусветнай літаратуры, этнаграфіі, мастацкай культуры, філасофіі, фалькларыстыцы і іншых дысцыплінах. Асаблівасці метадалагічных прынцыпаў і метадаў для аналізу культуралагічных праблем. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі і формы культуры. Развіццё тэорыі і практыкі міжкультуных камунікацый. Сутнасць мэты, і віды міжкультурнай камунікацыі. Акультурацыя ў міжкультурнай камунікацыі: сутнасць, стратэгія, вынікі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– сэнс базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– праблемы міжкультурных камунікацый у кантэксце глабалізацыйных працэсаў;

**умець:**

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць дзейнасць у галіне культуры;

– адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі;

**валодаць:**

– важнейшымі метадалагічнымі парадыгмамі, прынцыпамі і метадамі культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы.

***Прыкладная культуралогія***

Прыкладная культуралогія як працэс засваення, захавання, стварэння і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры, спасціжэння індывідам вынікаў гэтай дзейнасці і працэс прыцягнення яго ў вытворчасць каштоўнасцей культуры. Сацыяльна-культурная дзейнасць як спецыялізаваная вобласць грамадскай практыкі. Прадмет, мэты і задачы, панятыйны апарат і крыніцы курса. Сацыяльна-культурная дзейнасць як інтэгратар грамадскага ўзаемадзеяння і фактар творчага развіцця асобы. Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці. Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць, прынцыпы, функцыі і метады сацыяльна-культурнай дзейнасці. Рэсурсная база сацыяльна-культурнай дзейнасці. Суб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці. Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Прынцыпы і прыёмы рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Выразныя сродкі рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Асаблівасці драматургіі і рэжысуры тэатралізаваных формаў культурна-адпачынкавых праграм. Арганізацыйна-творчыя асновы прафесійнай дзейнасці рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– структурны склад і асноўныя функцыі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– асаблівасці драматургіі і рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм;

– тэорыю рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм, яе прынцыпы, прыёмы і выразныя сродкі;

– асноўныя законы драматургічнай кампазіцыі;

– мэты, задачы, прынцыпы і кірункі сацыякультурнага праектавання;

– заканамернасці развіцця сучаснай арт-індустрыі ў Беларусі;

– спецыфіку выкарыстання канцэпцый, механізмаў і метадаў арт-менеджменту ў працэсе кіравання арт-індустрыяй;

**умець:**

– асэнсоўваць культурную практыку, тлумачыць пэўныя культурныя з'явы, выкарыстоўваць сацыякультурныя тэхналогіі;

– ствараць "сцэнарны план", літаратурны сцэнарый, "мантажны ліст";

– умець ужываць на практыцы засвоены метад творчага мантажу сцэнарнага матэрыялу;

– распрацоўваць праектнае рашэнне праблемнай сітуацыі на асобасным узроўні, на ўзроўні калектыву, насельніцкага пункту, сацыяльных, прафесійных і культурных супольнасцяў;

– выяўляць асноўныя напрамкі і тэндэнцыі развіцця арт-індустрыі;

– выконваць арганізацыйна-творчую дзейнасць у розных сегментах арт-індустрыі;

**валодаць:**

– сродкамі мастацкай выразнасці культурна-адпачынкавых праграм;

– методыкай арганізацыі і правдзення рэпетыцый з выканаўцамі;

– тэарэтыка-метадалагічнымі і практычнымі падыходамі да сацыяльна-культурнага праектавання;

– прыёмамі работы спецыяліста ў арт-індустрыі.

***Менеджмент і маркетынг у сферы культуры***

Менеджмент як кіраванне людзьмі ў арганізацыях на аснове дынамічных метадаў аналізу, прыняцця рашэнняў і зносін, якія накіраваны на дасягненне мэт шляхам выкарыстання запланаваных, арганізаваных і кантраляваных сродкаў. Скіраванасць менеджменту ў сферы культуры на праблемы кіравання чалавечымі адносінамі ў сацыяльна-культурных сістэмах падчас вытворчасці, распаўсюджванні і спажыванні культурных прадуктаў.

Маркетынг як тэорыя і практыка арганізацыі дзелавой актыўнасці на рынку і тэхналогія ўплыву на рыначную сітуацыю. Магчымасці маркетынгу ў развіцці сферы культуры, эфектыўнай дзейнасці яе ўстаноў і арганізацый, паспяховай рэалізацыі канкрэтных праектаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– эвалюцыю і школы менеджмента; сістэму асноўных катэгорый;

– метады і функцыі кіравання; кіраўніцкія рашэнні;

– стылі кіравання і патрабаванні да менеджара;

– арганізацыйную структуру менеджменту як кіравання вытворчымі адносінамі па аднаўленні і распаўсюджванні культурных каштоўнасцяў, арганізацыі вольнага часу насельніцтва;

– сістэму арганізацыі маркетынгавых даследаванняў, асноўныя элементы комплексу маркетынгу;

**умець:**

– аналізаваць унутранае і знешняе асяроддзе арганізацыі культуры, яе жыццёвы цыкл;

– далучаць розныя крыніцы да фінансавання культурных праектаў і праграм;

– здабываць маркетынгавую інфармацыю і выкарыстоўваць яе для прасоўвання культурнага тавару;

**валодаць:**

– трывалымі арганізацыйнымі навыкамі для работы ва ўстановах культуры ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах, тэхналогіямі культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– разнастайнымі інструментамі маркетынгавай камунікацыі.

7.5.5 Змест вучэбных дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі і вучэбных дысцыплін цыкла спецыялізацый, а таксама патрабаванні да кампетэнцый па гэтых вучэбных дысцыплінах устанаўліваюцца вучэбнымі праграмамі ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах на аснове патрабаванняў сапраўднага адукацыйнага стандарта.

**7.6 Патрабаванні да зместу і арганізацыі практык**

Пры праходжанні практыкі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцах 2, 3 дадзенага адукацыйнага стандарта.

***7.6.1 Азнаямленчая практыка***

Наведванне ўстаноў культуры розных тыпаў і кіраўніцкіх структур розных узроўняў. Вывучэнне структуры органаў кіравання сацыяльна-культурнай сферай і накірункаў іх дзейнасці. Вывучэнне і аналіз асноўных накірункаў і форм работы ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы. Апісанне арганізацыйных структур і сістэмы планавання з пункту гледжання структуры і зместу. Вывучэнне нарматыўных дакументаў, штатнага раскладу, пасадавых і функцыянальных абавязкаў супрацоўнікаў устаноў культуры. Аналіз дзейнасці ўстаноў культуры і вольнага часу па задавальненню сацыяльна-культурных патрэбнасцей насельніцтва ў сферы вольнага часу. Вывучэнне дыферынцыраванага падыходу ўстаноў культуры і вольнага часу па арганізацыі дасуга розных катэгорый насельніцтва. Вывучэнне камерцыйнай дзейнасці ўстаноў культуры. Азнаямленне з комплексам тэхнічных сродкаў падтрымкі дзейнасці ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы. Наведванне культурна-адпачынкавага мерапрыемства, яго аналіз і ўдзел у абмеркаванні.

***7.6.2 Педагагічная практыка***

Вывучэнне прагназавання, планавання і ажыццяўлення арганізацыйна-метадычнай, творчай, адміністрацыйнай дзейнасці устаноў сацыякультурнай сферы. Авалоданне методыкай выкладання культуралагічных дысцыплін для ўсіх узроставых катэгорый. Аналіз існуючых праграм па культуралагічных дысцыплінах. Аналіз методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін у школах мастацтваў і установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Авалоданне методыкай арганізацыі правядзення ўрокаў і выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі.

***7.6.3 Тэхналагічная практыка***

Вывучэнне прагназавання, планавання і ажыццяўлення арганізацыйна-метадычнай, творчай і адміністрацыйнай дзейнасці ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы. Авалоданне тэхналогіямі кіраўнічай дзейнасці ў пэўнай галіне сацыякультурнай сферы (канцэртна-відовішчная дзенасць, рэкламна-маркетынгавая дзейнасць, інфармацыйна-метадычная дзейнасць, арганізацыя міжнародных культурных сувязей). Знаёмства з тэорыяй і практыкай арганізацыйна-кіраўніцкай, фінансава-камерцыйнай і прадпрымальніцкай дзейнасцю ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы. Ацэнка стану метадычнага і тэхнічнага забеспячэння дзейнасці базавай установы. Ацэнка ступені інфарматызацыі і аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, распрацоўка рэкамендацый па інфарматызацыі дзейнасці базавай установы. Удзел у выкарыстанні і распрацоўцы аўтаматызаваных сродкаў падтрымкі дзейнасці ўстановы культуры. Аналіз культурнага супрацоўніцтва Беларусі з краінамі блізкага і далёкага замежжа.

***7.6.3 Пераддыпломная практыка***

Пераддыпломная практыка з'яўляецца заключным этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста, патэнцыяльнага кіраўніка ўстаноў, арганізацый, супрацоўніка органаў кіравання ў галіне культуры. Мэта практыкі – замацаванне кампетэнцый, атрыманных у ходзе засваення комплексаў спецыяльных дысцыплін, а таксама праверка прафесійнай падрыхтаванасці студэнтаў да самастойнай адміністратыўна-кіраўнічай дзейнасці. Асноўныя задачы практыкі – выпрацоўка навыкаў інавацыйнай дзейнасці ў сацыякультурнай сферы, збор і абагульненне інфармацыі па тэме дыпломнай работы; апрабацыя распрацовак і вынікаў дыпломнай работы; правядзенне даследчых работ, а таксама работ па распрацоўцы і ўкараненні метадычнага забеспячэння працэсаў інфарматызацыі культуры і мастацтва; набыццё вопыту аналітычнай і навукова-даследчай дзейнасці ва ўстановах культуры; выкананне заданняў на аснове правядзення эксперыментальна-даследчай работы.

## 8 Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу

### 8.1 Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу

Педагагічныя кадры ўстановы вышэйшай адукацыі павінны:

– мець вышэйшую адукацыю, якая адпавядае профілю выкладаемых вучэбных дысцыплін і, як правіла, адпаведную навуковую кваліфікацыю (навуковую ступень і (або) навуковае званне);

– займацца навуковай і (або) навукова-метадычнай дзейнасцю;

– не радзей аднаго разу ў 5 гадоў праходзіць павышэнне кваліфікацыі;

– валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу на належным узроўні;

– валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу са студэнтамі.

### 8.2 Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу

Установы вышэйшай адукацыі павінны мець:

– матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходную для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы студэнта;

– сродкі навучання, неабходныя для рэалізацыі адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)" (прыборы, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп'ютары, камп'ютарныя сеткі, аўдыявізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб'екты).

### 8.3 Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

– вучэбныя дысцыпліны павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, даведачнай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вучэбна-метадычнамі, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі;

– павінен быць забяспечаны доступ для кожнага студэнта да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленнага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (варыятыўных мадэляў самастойнай работы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый і г.д.).

**8.4 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў**

Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**8.5 Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы**

Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-плануючай дакументацыяй выхавання.

**8.6 Агульныя патрабаванні да формаў і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый**

8.6.1 Канкрэтныя формы і працэдуры прамежкавага кантролю ведаў навучэнцаў па кожнай вучэбнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай кафедрай установы вышэйшай адукацыі і адлюстроўваюцца ў вучэбным праграмах установы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

8.6.2 Для атэстацыі навучэнцаў на адпаведнасць іх персанальных дасягненняў паэтапным або канчатковым патрабаванням адукацыйнай праграмы ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыповыя заданні, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых работ і праектаў, тэматыку рэфератаў, метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы складання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый навучэнцаў і інш. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

Ацэначнымі сродкамі павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці навучэнцаў да творчай дзейнасці, іх гатоўнасць весці пошук рашэнняў новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

8.6.3 Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма.
2. Пісьмовая форма.
3. Вусна-пісьмовая форма.
4. Тэхнічная форма.

Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. Субяседаванні.
2. Калёквіумы.
3. Даклады на семінарскіх занятках.
4. Даклады на канферэнцыях.
5. Вусныя залікі.
6. Вусныя экзамены.
7. Ацэньванне на аснове дзелавой гульні.
8. Тэсты дзеянняў.
9. Іншыя.

Да пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. Тэсты.
2. Кантрольныя апытванні.
3. Кантрольныя работы.
4. Эсэ.
5. Рэфераты.
6. Курсавыя работы (праекты).
7. Справаздачы па навукова-даследчай рабоце.
8. Стандартызаваныя тэсты.
9. Ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.
10. Ацэньванне на аснове кейс-метаду.

11. Ацэньванне на аснове партфоліа.
12. Ацэньванне на аснове дзелавой гульні.
13. Іншыя.

Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. Справаздачы па аўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай.
2. Справаздачы па лабараторных работах з іх вуснай абаронай.
3. Курсавыя *работы з іх вуснай абаронай.*
4. Залікі.
5. Экзамены.
6. Абарона дыпломнай работы.
7. Ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.
8. Ацэніванне на аснове дзелавой гульні.
9. Ацэньванне на аснове праектнага метаду.
10. Іншыя.

*Да тэхнічнай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:*

1. Электронныя тэсты.
2. Электронныя практыкумы.
3. Візуальныя лабараторныя работы.
4. Іншыя.

## 9 Патрабаванні да выніковай атэстацыі

### *9.1 Агульныя патрабаванні*

9.1.1 Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

9.1.2 Да выніковай атэстацыі допускаюцца студэнты, якія поўнасцю выканалі вучэбны план і вучэбныя праграмы.

9.1.3 Выніковая атэстацыя студэнтаў пры засваенні адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)", напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 "Культуралогія (фундаментальная)" праводзіцца ў форме двух дзяржаўных экзаменаў: 1) па вучэбнай дысцыпліне "Педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін", 2) *па вучэбных дысцыплінах напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі,* а таксама абароны дыпломнай работы.

Выніковая атэстацыя студэнтаў пры засваенні адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 04 01 "Культуралогія (па напрамках)", напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 "Культуралогія (прыкладная)" праводзіцца ў форме двух дзяржаўных экзаменаў: 1) па вучэбных дысцыплінах напрамку спецыяльнасці, 2) па вучэбных дысцыплінах цыкла дысцыплін спецыялізацыі, а таксама абароны дыпломнай работы.

9.1.4 Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцах 2,3 *сапраўднага адукацыйнага стандарта.*

### 9.2 Патрабаванні да дзяржаўнага экзамену

Дзяржаўны экзамен праводзіцца на пасяджэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваюцца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

### 9.3 Патрабаванні да дыпломнай работы

Патрабаванні да структуры, зместу, аб'ёму і парадку абароны дыпломнай работы вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове сапраўднага адукацыйнага стандарта і Правіл правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

**Дадатак**
(інфармацыйны)

**Бібліяграфія**

*[1] Кодекс Республики Беларусь об образовании, 13 янв. 2011 г., № 243-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 13. – 2/1795.*

*[2] Государственная программа развития высшего образования на 2011-2015 гг.: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июл. 2011 г., № 893 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 79. – 5/34104.*

*[3] Общегосударственный классификатор Республики Беларусь. Специальности и квалификации: ОКРБ 011-2009. - Введ. 01.07.09. – Минск: М-во образования Респ. Беларусь: РИВШ, 2009. – 418 с.*